Святлана ГУТКОЎСКАЯ

# Сучасны танец
## жанчыны ставяць для мужчын

**Пасляслоўе да IFMC–2004**

**Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі (IFMC), які напрыканцы мінулага года адбыўся ў Віцебску ўжо семнаццаты раз, – знакавая з'ява ў культурным жыцці не толькі Беларусі, але і суседніх краін. Фестываль – першы такога накірунку на ўсёй постсавецкай прасторы (для параўнання нагадаем, што міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі ў Маскве «Dance Inversion» прайшоў толькі чацвёрты раз) – жыве дзякуючы падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета РБ, Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі нашай краіны і найперш дзякуючы намаганням супрацоўнікаў Віцебскага культурна-дзелавога цэнтра ААТ «КІМ», кампаніі Арт Марк пад кіраўніцтвам ініцыятара правядзення танцавальнага форуму і яго нязменнага дырэктара Марыны Раманоўскай.**

*Балет «Яна». Харэаграфічная студыя Д.Юрчанка (Віцебск).*



Бываю на IFMC з 1996 года (госцяй, кіраўніком калектыву – удзельніка конкурсу балетмайстарскіх работ, членам секцыі крытыкі), хачу адзначыць заўсёдную добразычлівую атмасферу на гэтым свяце сучаснага танца, а таксама самую высокую ступень арганізацыі работы фестывалю – нягледзячы на многія цяжкасці, з якімі даводзіцца сутыкацца ягоным арганізатарам.

Традыцыйна асноўнай фестывальнай падзеяй з'яўляецца конкурс сучаснай харэаграфіі, які летась меў статус нацыянальнага. Дванаццаць калектываў нашай краіны, што прайшлі папярэдні адборачны адзатур, паказалі на конкурсе 26 танцавальных твораў, сярод якіх былі аднаактовыя балеты, і фрагменты з балетаў, і харэаграфічныя мініяцюры.

Арганізатары фестывалю пастаянна шукаюць новыя формы папулярызацыі мастацтва сучаснага танца, спрыяюць абмену творчымі ідэямі і практычным вопытам яго прыхільнікаў, уносяць змены ў праграму фестывалю з мэтай яго ўдасканалення. Такім новаўвядзеннем летась стала адмаўленне ад прысуджэння Гран-пры, I-га, II-га і III-га месцаў і ўстанаўленне розных намінацый – як традыцыйных, узятых з багажу мінулых фестываляў, так і новых – «Школа», «Педагог», «Харэограф», «Артыст» і інш., закліканых у першую чаргу падкрэсліць моцныя бакі дзейнасці таго ці іншага айчыннага харэографа і калектыву, што працуюць на ніве сучаснай харэаграфіі. Даць прафесійную ацэнку творам харэографаў і вынікам педагагічнай дзейнасці школ і студый сучаснага танца быў закліканы экспертны савет, члены якога і вызначалі лаўрэатаў у заяўленых намінацыях.

Карціна фестывальнага жыцця, акрамя ўласна конкурсу, уключала канцэрт-адкрыццё IFMC-2004 з тэатралізаваным прадстаўленнем яго ўдзельнікаў і гала-канцэрт закрыцця, высокапрафесійныя выступленні вядомых айчынных і замежных майстроў сучаснай харэаграфіі, конкурсныя майстар-класы, «круглыя сталы», прэс-канферэнцыі, урачыстую цырымонію ўзнагароджання лаўрэатаў Нацыянальнага конкурсу і іншыя мерапрыемствы.

Сярод замежных гасцей былі два славутыя расійскія калектывы. Пермскі дзяржаўны тэатр «Балет Яўгена Панфілава», якім пасля трагічнай гібелі яго заснавальніка кіруе саліст трупы Сяргей Райнік, паказаў бліскучую харэаграфічную мініяцюру «Фігляр» на музыку Сцімхорн у незабыўным выкананні абаяльнага Аляксея Колбіна, балет «Балеро» Равэля, выкананы мужчынскім складам трупы, добра вядомыя беларускаму гледачу «Вальсы для памутнелых розумам» на музыку Штрауса і Вальдтэйфеля, арыгінальна вырашаныя ў камічным ключы, а таксама фрагменты з балета Пракоф'ева «Рамэо і Джульета», усё – у харэаграфіі Я.Панфілава, які быў надзвычайна адораным і пладавітым балетмайстрам-пастаноўшчыкам нашага часу.

Калектыў з Пярмі і асабліва яго заснавальнік адыгралі прыкметную ролю ў станаўленні фестывалю (удзельнічалі ў ім на працягу многіх гадоў), і невыпадкова дырэкцыя IFMC заснавала прыз імя Яўгена Панфілава. Гэтым разам ён дастаўся маладому харэографу Дзіяне Юрчанка – мастацкаму кіраўніку аднайменнай студыі з горада Віцебска, якая дэбютавала на конкурсе IFMC у 2002 годзе, а цяпер паказала тры новыя харэаграфічныя мініяцюры. Адна з іх, «Смага», прысвечаная патрыятычнай тэматыцы (дарэчы, надзвычай папулярнай на гэтым конкурсе), вырашалася з выкарыстаннем выразных сродкаў, уласцівых хутчэй драматычнаму тэатру і таму была не надта ўдалай.

Больш цікавым атрымаўся харэаграфічны твор «Яна» на музыку сучасных замежных кампазітараў. У ім прасочваюцца тры перыяды з жыцця жанчыны: дзяцінства, маладосць, нарэшце, старасць, набліжэнне канца. Усё драматургічна дакладна пабудаванае дзейства адначасова раз-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

гортваецца ў дзвюх прасторах – на сцэне і на вялікім экране, і відэарад умела дапаўняе тое, што адлюстроўваюць рухі танцораў. Харэограф не расказвае нейкую гісторыю, а імкнецца да метафар у пластыцы, атрыбутах, касцюмах, што абуджае фантазію гледача. Умела выкарыстоўвае аўтар і папулярны ў розных відах мастацтва прыём гіпербалы, перабольшання. Скажам, каса гераіні спачатку служыць упрыгожаннем і сімвалізуе жыццё, а потым зацягваецца, нібы пятля, на яе шыі. Эфектна пастаўлены фінал кампазіцыі: дзе салістка ідзе па авансцэне з адной кулісы ў другую, а ўсе астатнія выканаўцы рухаюцца спінай у процілеглым напрамку, дзякуючы чаму ствараецца ўражанне, што ў канцы зямнога шляху ўсё жыццё ў адно імгненне прабягае перад яе вачыма.

Арыгінальна вырашыла Д.Юрчанка і харэаграфічную мініяцюру «Рэўнасць», знайшоўшы цікавы прыём для ўвасаблення сваёй балетмайстарскай задумы. Жанчына, апранутая ў ярка-чырвоную шырокую сукенку, пакутуе ад душэўнага болю, а мужчына ў чорным, які з'яўляецца ў нейкі момант з нетраў жаночага адзення, успрымаецца і як увасабленне самога горкага пачуцця, што спапяляе жанчыну знутры, і як тая асоба, якую яна раўнуе. Гарманічнымі падаюцца і іспанскія інтанацыі ў музычным суправаджэнні і ў пластыцы, а таксама стылізаваны гісторыка-бытавы касцюм. Экспрэсіўнае выкананне мініяцюры акцёрамі драматычнага тэатра Наталляй Куржалавай і Аляксандрам Андрыенкам перакана ўча перадае іранічны погляд самога пастаноўшчыка.

Другі госць фестывалю – харэаграфічная кампанія «Эксцэнтрык-балет» з Екацярынбурга – паказаў урывак з аднаактовага балета «Выхад» (на музыку Мерэдзіта Монка, Сяргея Абедніна і групы «Art of Noise») у харэаграфіі мастацкага кіраўніка трупы Сяргея Смірнова. Безумоўныя вартасці гэтага твора і высокі выканальніцкі ўзровень удзельнікаў трупы ўжо былі высока ацэнены віцебскай публікай падчас мінулага фэсту. Гэтым разам калектыў парадаваў прэм'ерай балета «Анучны кут», пастаўленага таксама С.Смірновым на музыку Горана Брэгавіча, Сяргея Абедніна і фальклорныя мелодыі. Стылізаваныя рухі і традыцыйныя малюнкі народных танцаў розных краін надзвычай арганічна спалучаюцца ў творы з танцавальнымі элементамі і прыёмамі арганізацыі сцэнічнай прасторы, уласцівымі менавіта сучаснай харэаграфіі. Каларытнае і лексічна насычанае пластычнае дзейства развіваецца ў рамках адзінага сюжэта, у цэнтры якога – тонка выпісаны вобраз жанчыны-лялькі, што марыць пра шчасце. За наўмысна лялечнымі механістычнымі танцавальнымі рухамі шасці выканаўцаў, кожны з якіх надзелены яркай індывідуальнасцю, угадваюцца моцныя чалавечыя страсці. Балетмайстар дэманструе добрае веданне танцавальнай спадчыны і ўменне стварыць на яе аснове па-сапраўднаму сучасны спектакль у стылі contemporary dance, да таго ж пададзены з гумарам, што выклікае жывую рэакцыю глядзельнай залы.

У якасці госця прыехаў на фестываль вядомы беларускі калектыў з Гродна – неаднаразовы ўладальнік прэмій IFMC танц-тэатр «Галерэя» пад кіраўніцтвам Аляксандра Цебянькова, які прадставіў на суд гледачоў танцавальны спектакль пад рамантычнай назвай «Кветкі ў акне», арыгінальны па падборы выразных сродкаў, бездакорны па выкананні, хоць і не пазбаўлены запазычанняў з творчага багажу некаторых сусветна вядомых харэографаў-мадэрністаў.

Сам конкурс прадставіў крытыкам і гледачам як добра вядомыя ў нашай краіне, так і новыя ў галіне сучаснага танца імёны харэографаў і калектывы.

Свядомай арыентацыяй на еўрапейскі танцавальны мадэрнізм вызначаліся работы Іны Асламавай – гомельскага харэографа і кіраўніка групы сучаснай харэаграфіі «Квадра», пастаяннай удзельніцы IFMC (харэаграфічная кампазіцыя «Чорныя клеткі белыя», абсурдысцкі аднаактовы балет «Зіма прапала»). Аддзяленне сучаснага танца Гомельскай дзіцячай харэаграфічнай школы прадставіла ў конкурснай праграме ажно шэсць харэаграфічных мініяцюр. І.Асламава падабрала цікавы музычны матэрыял для ўсіх мініяцюр (асабліва вызначалася музыка для нумара «Рэ-рэ-ра», пазначаная ў праграме, як музыка Sainkho Namchilak). Аднак харэаграфія большасці твораў, нягледзячы на рамантычнасць і прэтэнцыёзнасць назваў (напрыклад, «Там, дзе нараджаецца вецер» або «Абдымаючы воблака»), была пазбаўлена адметнасці і, галоўнае, вобразнасці, і таму безаблічныя харэаграфічныя кампазіцыі і па форме, і па прыёмах арганізацыі танцавальнага матэрыялу хутчэй нагадвалі выніковыя ўрокі па сучаснай пластыцы.


*Харэаграфічная мініяцюра «Мары рыжага чалавечка». В.Лабоўкіна (Гродна).*

З гэтага шэрагу выгадна вылучалася ўжо вядомая спецыялістам па іншых конкурсах (Міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» і Рэспубліканскі агляд-конкурс харэаграфічных школ) мініяцюра той жа І.Асламавай «Званочкі», у пластыцы якой прысутнічала вобразнасць, заяўленая ў назве твора. І.Асламава атрымала дыплом у намінацыі «Харэограф», што ў многіх выклікала пэўнае здзіўленне. Больш заслужанай аказалася яе перамога ў намінацыі «Педагог», дзе галоўным крытэрыем быў узровень правядзення майстар-класа, а Гомельская дзіцячая харэаграфічная школа слушна была адзначана ў намінацыі «Школа», дзе ацэньвалася сістэма падрыхтоўкі артыстаў сучаснага танца.

Прыемна адзначыць, што ансамбль кафедры харэаграфіі Бела-

РЭПАЗІТОРЫЙ



*Балет «Пяць ложкаў». Ансамбль кафедры харэаграфіі Беларускага універсітэта культуры і мастацтва.*

*Спектакль «Анучны кут». «Эксцэнтрык-балет» С.Смірнова (Екацярынбург).*



рускага універсітэта культуры і мастацтваў стаў лаўрэатам фестывалю і ўладальнікам дыплома ў намінацыі «Выканальніцкае майстэрства». Калектыў, які паспяхова ўдзельнічае ў Віцебскім форуме ўжо чацвёрты раз, прапанаваў аўтарскія работы харэографа з ЗША Нэты Пульвермахер: фрагмент з балета «Пяць ложкаў / Дзеці мары» на музыку Ювала Габэя і харэаграфічную мініяцюру «Вівальдыяна» на музыку А.Вівальдзі. Пастаноўка іх была здзейснена амерыканскім харэографам разам са студэнтамі універсітэта ў чэрвені мінулага года, у рамках сумеснага беларуска-амерыканскага праекта ў галіне сучаснай харэаграфіі. Праца з высокаадукаваным амерыканскім харэографам, а таксама тое, што некалькі ўдзельнікаў ансамбля мелі магчымасць напярэдадні фестывалю стажыравацца ў лепшых педагогаў у Нью-Йорку – прызнанай сталіцы сучаснага танца, тлумачыць сапраўды высокі выканальніцкі ўзровень калектыву. Цікава, што ва ўрыўках з балета «Пяць ложкаў», у якім арганічна сінтэзаваліся выразныя сродкі розных відаў мастацтва, выканаўцы аднолькава добра танцавалі, гралі на флейтах, спявалі і разыгрывалі драматычныя сцэны, а гэта ж вымагала ад кожнага з іх праяўлення самых розных здольнасцяў.

Гэтым разам застаўся неўганараваным вядомы і, безумоўна, адораны наш харэограф Дзмітрый Куракулаў, які кіруе групай сучаснай харэаграфіі «Тад» – адным з першых калектываў гэтага накірунку ў нашай краіне. Ён меў усе падставы прэтэндаваць на перамогу і ў намінацыі «Педагог» (шмат гадоў паспяхова выкладае сучасны танец на аддзяленні харэаграфіі Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў і нават прывёз на фестываль сваіх выхаванцаў – навучэнцаў гэтай установы), і ў намінацыі «Харэограф» (паказаў у конкурснай праграме цікавыя пастаноўкі).

Між тым, ягоная харэаграфічная мініяцюра «Бамжы» мае мноства лексічных знаходак, вынаходлівых падтрымак і нечаканы фінал: дворнікі раскідваюць кучу смецця, з якой паявіліся ў пачатку нумара і куды схаваліся ў канцы юнак з дзяўчынай, а іх там – няма, быццам зусім не існавала. Арыгінальнасцю вылучаўся і яго аднаактовы балет «Песні ваенных гадоў», які атрымаў неадназначныя ацэнкі гледачоў і крытыкаў: адных захапілі багацце і каларытнасць танцавальнай мовы і малюнкаў, умелае выкарыстанне харэографам тэатральных прыёмаў, асаблівая цеплыня атмасферы, створаная на сцэне пры раскрыцці патрыятычнай тэмы; іншым падача пластычнага матэрыялу паказалася ілюстрацыйнай. Тым не менш фрагмент з балета быў паказаны на гала-канцэрце закрыцця, дзе выступалі толькі лаўрэаты – пераможцы розных намінацый і госці танцавальнага форуму, і гэта красамоўна сведчыць аб прызнанні таленту Д.Куракулава.

Варта адзначыць, што ён не толькі сам фанатычны прыхільнік і папулярызатар сучаснага танца, але і натхняе, зараджае іншых сваёй творчай энергіяй. Так, у конкурсе ўдзельнічала былая танцоўшчыца з калектыву «Тад» Вольга Лабоўкіна з харэаграфічнай мініяцюрай «Мары рыжага чалавечка» (ва ўласнай пастаноўцы). Акурат Д.Куракулава Вольга лічыць сваім настаўнікам. Яе дэбют аказаўся ўдалым, Вольга перамагла ў намінацыі «Артыст», прадэманстраваўшы ў тонкай псіхалагічнай замалёўцы (цяжарная маладая жанчына вырашае, раджаць ёй дзіця ці не) безумоўныя акцёрскія здольнасці і добрыя танцавальныя магчымасці. Асабліва пранізліва ўспрымалася яе «адажыо з падушкай», якой, быццам самай блізкай сяброўцы, давярала яна свае думкі і пачуцці.

Прэмію «Дэбют» атрымала Ірына Стамінская з Оршы – за харэаграфічную мініяцюру «Дзве песні» на музыку Паўла Кашына, прысвечаную тэме вайны. Вядомая як цудоўны пастаноўшчык нумароў у жанры народна-сцэнічнага танца і мастацкі кіраўнік папулярнага ў Беларусі дзіцячага ўзорнага ансамбля «Весялушкі», яна вырашыла паспрабаваць сябе ў жанры сучаснай харэаграфіі – і не памылілася. У першай частцы твора ў цэнтры дзеяння – вобраз дзяўчыны-нявесты, якая праводзіла свайго выбранніка на вайну і засталася адна, а ў другой – вобраз хлопца-салдата, які апынуўся ў нямецкім палоне. Своеасаблівы, трапятлівы пластычны лейтматыў галоўных герояў арганічна падтрымліваецца унісоннымі рухамі. Нумар, створаны з улікам юнага ўзросту танцоўшчыкаў і выкананы імі з захапленнем і поўнай самааддачай, пакінуў вельмі прыемнае ўражанне.

Уладальнікам дыплома ў намінацыі «Твор» стаў калектыў Віцебскага дзяржаўнага універсітэта за харэ-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

аграфічную мініяцюру «СамАлётчыкі», пастаўленую Аляксеем Ліцвіным. Работа вылучалася адмысловай прывабнасцю, арыгінальнай канцэпцыяй і эмацыйнасцю.

Сучасная харэаграфія вымагае ад гледачоў шырыні кругагляду. Ім, напрыклад, пажадана разбірацца ў мастацтве авангарду і мець уяўленне пра супрэматызм, каб зразумець сэнс харэаграфічнай мініяцюры пад назвай «Супрэматычны балет». Гэта работа, паказаная на конкурсе віцебскай студыяй сучаснага танца «Паралелі» пад кіраўніцтвам Настассі Махавай, атрымала спецыяльную прэмію «Стыль» і сталася спробай аўтара ўзнавіць ва ўласнай інтэрпрэтацыі паказанае ў 1920 годзе ў Віцебску эксперыментальнае прадстаўленне пад той жа назвай. (Новае прачытанне харэаграфічных мініяцюр і балетаў, створаных у мінулым стагоддзі, актыўна ўвайшло ў моду. Так, французская трупа «Pedro Poueles Company» паказала ў Маскве на апошнім фестывалі сучаснага танца ажно восем варыяцый на тэму славутага «Лебедзя» Міхаіла Фокіна на музыку Сен-Санса, якія суправаджаліся дэманстрацыяй дакументальных кадраў з легендарнай Ганнай Паўлавай у гэтай ролі.) Найбольш моцным у пастаноўцы Н.Махавай, як ні дзіўна, аказаўся відэарад, які выклікаў у памяці беспрадметныя жывапісныя работы стваральніка супрэматызму Казіміра Малевіча (камп'ютэрная графіка Аляксея Ермакова). Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што харэаграфія, слушна задуманая пастаноўшчыкам як поліфанічнае дзеянне, не атрымала адпаведнага ўвасаблення.

Завяршэнне работы чарговага форуму міжволі спараджае жаданне вярнуцца да былых віцебскіх фестываляў. У параўнанні з папярэднім, які прыцягнуў мноства зорных імёнаў, але быў адзначаны панаваннем (галоўным чынам у пастаноўках заходнееўрапейскіх аўтараў) тэндэнцый песімізму, дэпрэсіі і безвыходнасці, апошні фестываль, хоць і больш сціплы па маштабе, культываваў пазітыўныя эмоцыі і настроі, вылучаўся свядомай гуманістычнай накіраванасцю. Як сказала старшыня экспертнага савета доктар мастацтвазнаўства Юлія Чурко, у айчыннай харэаграфіі «ёсць свой славянскі твар, які не сцерці ніякімі заходнімі ўплывамі». Невыпадкова так моцна была прадстаўлена ў конкурснай праграме патрыятычная тэматыка, увасобленая мовай пластыкі вельмі разнастайна: і трагічна, і светла, і на поўны голас, і шэптам. Другі член экспертнага савета Таццяна Катовіч адзначыла, што беларускія харэографы ў сваіх творах надаюць вялікую ўвагу сэнсу. Значна ўзрос выканальніцкі ўзровень айчынных калектываў. Добрую прафесійную падрыхтоўку нашых танцоўшчыкаў адзначылі вядомыя спецыялісты ў галіне сучаснай харэаграфіі — балетны крытык з Літвы Віта Мазурайтэ і лаўрэат міжнародных конкурсаў сучаснага танца расіянка Наталля Масленікава.

На апошнім фестывалі ўпершыню так нязмушана і шматаблічна выйшла на сцэну будучыня нашай сучаснай харэаграфіі — сённяшнія юныя навучэнцы студый і школ. Акрамя названай вышэй Гомельскай дзіцячай харэаграфічнай школы, у фестывалі ўдзельнічала дзіцячая харэаграфічная студыя «Фолюш-балет» з Гродна. Якасць іх падрыхтоўкі пацвярджае, што ў Беларусі сучасны танец знайшоў прыдатную глебу.

Таксама першы раз у межах фестывалю адбыліся конкурсныя майстар-класы, дзе айчынныя харэографы змаглі прадэманстраваць сваё педагагічнае майстэрства. Сярод педагогаў, акрамя І.Асламавай, спецыялісты адзначылі гамяльчанку Вольгу Захарчанка.

Конкурс прадэманстраваў схільнасць айчынных харэографаў да малых формаў — у праграме было паказана больш за 20 харэаграфічных мініяцюр і толькі 3 аднаактовыя балеты.

Геаграфія ж удзельнікаў нацыянальнага конкурсу практычна засталася той жа: найбольш актыўна сучасны танец развіваецца ў Гродне, Гомелі, Віцебску і Мінску. Сярод харэографаў-пастаноўшчыкаў па-ранейшаму пераважаюць жанчыны: на гэтым конкурсе з імі спаборнічалі толькі два прадстаўнікі моцнага полу — Д.Куракулаў і А.Ліцвін. Верагодна, можна гаварыць пра агульную тэндэнцыю. Цікавым у гэтай сувязі здаецца назіранне Марыса Бежара: «Класічны танец: мужчыны прыдумваюць харэаграфію для жанчын. Сучасны танец: жанчыны ставяць для мужчын».

На заканчэнне хачацца адзначыць, што Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску шукае і ўвесь час абнаўляе сваю канцэпцыю развіцця сучаснага танца. Фестывальныя паказы з'яўляюцца легітымнай міжнароднай формай выступленняў калектываў з некамерцыйнымі праектамі, і таму IFMC дае унікальную, ці не адзіную для многіх беларускіх танцоўшчыкаў і труп магчымасць паказаць свае творы шырокай публіцы і спецыялістам, а для маладых харэографаў — выпрабаваць сябе ў творчым спаборніцтве і атрымаць першае прызнанне. Фестываль дазваляе ім пазнаёміцца з дасягненнямі прызнаных айчынных і замежных майстроў сучаснай харэаграфіі і аказвае рэальную практычную і метадычную дапамогу ў авалоданні тэхнікай розных сучасных накірункаў (праз тую ж арганізацыю майстар-класаў). Урэшце, фестываль выконвае ролю папулярызатара сучаснага танца, спрыяе інтэграцыі патэнцыялу Беларусі ў галіне сучаснай харэаграфіі ў сусветную культурную прастору.

*Харэаграфічная мініяцюра «Рэўнасць». Харэаграфічная студыя Д.Юрчанка (Віцебск).*

*Фота І.Гусакова.*

